Опубликовано: 27 февраля 2014

# Вяртанне з мінулага

Наш зямляк Іван Кандрацьеў — аўтар добра вядомай песні “По диким степям Забайкалья”Прыкмета нашага часу: вяртаюцца з мінулага імёны людзей, якія, плённа папрацаваўшы на агульную карысць, у сілу розных прычын аказаліся забытымі. Раней вось і я не ведаў пра Івана Казіміравіча Кандрацьева, а гэта ж выдатны паэт, празаік, перакладчык, драматург, краязнаўца. Нарадзіўся ён у 1849 годзе ў вёсцы Каловічы (цяпер Вілейскі раён) у сялянскай сям’і. З маленства выявіліся творчыя здольнасці. Калі юнаку было 19, газета “Виленский вестник” надрукавала першы ягоны верш.
Наш зямляк Іван Кандрацьеў — аўтар добра вядомай песні “По диким степям Забайкалья”



Прыкмета нашага часу: вяртаюцца з мінулага імёны людзей, якія, плённа папрацаваўшы на агульную карысць, у сілу розных прычын аказаліся забытымі. Раней вось і я не ведаў пра Івана Казіміравіча Кандрацьева, а гэта ж выдатны паэт, празаік, перакладчык, драматург, краязнаўца. Нарадзіўся ён у 1849 годзе ў вёсцы Каловічы (цяпер Вілейскі раён) у сялянскай сям’і. З маленства выявіліся творчыя здольнасці. Калі юнаку было 19, газета “Виленский вестник” надрукавала першы ягоны верш. Большая частка жыцця Кандрацьева звязана з Масквой. З 70-х гадоў яго вершы, раманы, апавяданні з’яўляліся там у перыядычных выданнях. Вызначыўся наш зямляк і як акцёр, драматург. Будучы акцёрам трупы Народнага тэатра А. Ф. Фядотава, ён на выставе ў Маскве за гістарычную драму “На Паволжы” атрымаў высокую ўзнагароду — Вялікі залаты медаль. Напісаў раманы “Салтычыха”, “Гуны”, аўтар зборнікаў паэзіі “Думы і былі” ды “Пад шум дубраў”, гістарычных нарысаў “Сівая старына Масквы”, а для дзяцей выдаў чытанку “Іскра Божая”. Мала хто ведае, што менавіта Іван Кандрацьеў напісаў тэкст добра вядомай песні “По диким степям Забайкалья”, словы рамансаў “Очаровательные глазки” і “Эти очи — тёмны ночи”.

На яго тэксты пісалі музыку многія кампазітары, у тым ліку і Васілій Залатароў. Яго лепшымі сябрамі былі рускія пісьменнікі Уладзімір Гіляроўскі, Антон Чэхаў, Мікалай Успенскі, мастакі Васілій Сурыкаў, Ісаак Левітан, Аляксей Саўрасаў ды іншыя вядомыя людзі таго часу. Пра свайго таленавітага земляка жыхары Вілейшчыны больш даведаліся летась, калі выйшла кніга “Божы дар Івана Кандрацьева” загадчыка кафедры культуралогіі Беларускага дзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў, доктара культуралогіі Аляксандра Смоліка. Ён, дарэчы, таксама ўраджэнец той самай вёскі Каловічы. У маі 2013-га ў Вілейцы прайшлі першыя кандрацьеўскія чытанні, на яго малой радзіме ўстанавілі памятны знак.
А нядаўна ў бібліятэцы Універсітэта культуры і мастацтваў прэзентавалася кніга прафесара Аляксандра Смоліка, імпрэза ладзілася сумесна з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры. У чытальнай зале сабраліся калегі аўтара, выкладчыкі і студэнты, госці, журналісты. Рэй вяла супрацоўніца музея ды адначасова студэнтка ўніверсітэта Таццяна Ткачова. Аляксандр Смолік расказаў, як збіраў звесткі пра жыццёвы і творчы шлях земляка. Студэнты чыталі вершы Івана Кандрацьева, а Марыя Гарбачова праспявала яго раманс “Очаровательные глазки”. Цікавымі былі выступы Лідзіі Шагойкі з Музея літаратуры, а таксама даследчыцы песеннай творчасці Кандрацьева Вольгі Вярбіцкай, кандыдата культуралогіі Таісіі Сухоцкай ды іншых. Можна было набыць кнігу з аўтографам аўтара. Дарэчы, прадмову да яе напісаў Міністр культуры Барыс Святлоў. У кнізе расказваецца пра жыццёвы і творчы шлях творцы, у другой частцы пададзены ўрыўкі з твораў Івана Кандрацьева, якога сучаснікі небеспадставна параўноўвалі з Віктарам Гюго.

Лявон Целеш

На здымку:   Пісьменнік Іван Кандрацьеў